# V ЗВЫЧАЙНАЯ НЯДЗЕЛЯ

Аўтар: кс. Юрый Марціновіч
10.02.2019 00:00



**З Евангелля св. Лукі**

Натоўп ціснуўся да Езуса, каб слухаць слова Божае, а Ён стаяў каля возера Генэзарэт. І ўбачыў Ён два чаўны, якія стаялі каля возера, а рыбакі выйшлі з іх і паласкалі сеткі. Увайшоўшы ў адзін з чаўноў, які належаў Сымону, папрасіў яго крыху адплысці ад берага. Тады Ён сеў і вучыў людзей з чаўна. А калі скончыў гаварыць, сказаў Сымону: “Плыві на глыбіню, а вы закіньце сеткі вашыя для ўлову”. Сымон сказаў Яму ў адказ: “Настаўнік, мы працавалі ўсю ноч і нічога не злавілі, але на Тваё слова закіну сеткі”. Зрабіўшы так, яны злавілі вялікае мноства рыбы, аж пачыналі рвацца іхнія сеткі. І ківалі супольнікам, якія былі ў другім чаўне, каб прыйшлі дапамагчы ім. Тыя прыйшлі і напоўнілі абодва чаўны, так што яны пачалі тануць. Калі гэта ўбачыў Сымон Пётр, прыпаў да каленяў Езуса і сказаў: “Адыдзі ад мяне, Пане, бо я чалавек грэшны”. Бо з-за ўлову рыбы, якую злавілі, вялікае здзіўленне ахапіла яго і ўсіх, хто быў з Ім, а таксама Якуба і Яна, сыноў Зэбэдэя, якія былі супольнікамі Сымона. Тады сказаў Езус Сымону: “Не бойся, адгэтуль будзеш лавіць людзей”. А калі выцягнулі чаўны на бераг, пакінулі ўсё і пайшлі за Ім. † *Лк 5, 1–11*

Дапамога ад пана

Праз цудоўны ўлоў Хрыстос хацеў навучыць сваіх апосталаў, а таксама нас, сучасных людзей, што толькі адданай працы і шчырых намаганняў не дастаткова. Неабходны яшчэ абсалютны давер да Бога і старанная малітва аб Яго дапамозе. Без яе кожны чалавечы высілак марнуецца. Як гаворыць Псалміст, “калі Пан дому не збудуе, дарэмна над ім рамеснік працуе... Дарэмна вам уставаць на досвітку і сядзець дапазна...” (Пс 127, 2–3).

Вядома, мы не можам чакаць дапамогі ад Пана са складзенымі рукамі. Павінны вырашаць справы і праблемы, даручыўшы ўсё Усемагутнаму з непахіснай верай у тое, што Ён удзеліць нам сваю дапамогу.

 Ці здольны я папрасіць Яго аб дапамозе, каб Хрыстос мог мне дапамагаць?